**Векапо́мны** — які будзе доўга помніцца, незабыўны.
**Імпера́тар** — вышэйшы тытул манарха — асобы, якая ўзначальвае дзяржаву (цар, кароль і інш.).
**Фанабэ́рысты** — ганарысты, поўны важнасці, зазнайства.

## Фанабэрысты Мухамор

*(Байка)*

*Уладзі́мір Правасу́д*



Свяціўся векапомны бор,
У промнях сонца меддзю адліваўся.
Стаяў на тонкай ножцы Мухамор
І так перад грыбамі выхваляўся:
— Чамусьці кожны з вас лічыць прывык,
Што цар грыбоў у лесе — Баравік.
Такіх цароў, скажу я вам, багата.
А я над вамі ўсімі — імпера́тар!





Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

Хто задае ў модзе тон?
Хто адусюль відзён?
Я выгляд прыгажэйшы з прыгажэйшых маю...
— Прыгожы, але кожны абмінае, —
Заўважыў Падасінавічак жартам. —
Вось хвалішся, але чаго ты ва́рты?

Скажу я тут замест мара́лі:
Сам не хвалі сябе —
Хай іншыя пахваляць.

?

1. Дзе адбываюцца падзеі, апісаныя ў байцы?
2. Хто дзейнічае ў творы? Каго з іх можна назваць галоўным героем?
3. Якімі паказаны Мухамор і Падасінавічак у байцы?
4. Хто і за што асуджаецца ў творы? Выберыце адзін адказ з ліку прапанаваных:
   а) Падасінавічак за заўвагу Мухамору;
   б) Баравік за тое, што яго лічаць царом грыбоў;
   в) грыбы, якія не заўважалі прыгажосці Мухамора;
   г) Мухамор за сваю фанабэрыстасць.
5. Прачытайце словы, у якіх выказана мараль байкі, павучанне чытачу.
6. Разгледзьце ілюстрацыю да твора (с. 25). Паразважайце, ці ўдалося мастаку адлюстраваць характары галоўных герояў твора. Чаму?
7. Прачытайце памятку «Як падрыхтавацца да выразнага чытання байкі» (гл. форзац 2). Падрыхтуйце выразнае чытанне твора згодна з рэкамендацыямі памяткі.

**8.** Па магчымасці паспрабуйце праінсцэніраваць гэты твор. Разыграйце ў пары, як у тэатры, дыялог Мухамора і Падасінавічка. Вызначце характары герояў. Падумайце, з якой інтанацыяй трэба прамаўляць рэплікі.

## ЗАГАДКА

Стаіць у шапачцы агністай
На ўзлеску воін ганарысты.
Ад мух ахоўвае ён бор,
Завём яго мы ... .

*Міхась Пазнякоў.*



**Успомніце.** У якіх народных і аўтарскіх казках вы сустракаліся з вобразамі зайца, вожыка і ваўка? Якімі рысамі характару яны звычайна надзелены? Што можаце сказаць пра характар казачнай ваверкі?

*Пафантазіруйце.* На аснове загалоўка і ілюстрацыі паразважайце пра тэму аўтарскай казкі Васіля Гурскага. Хто з герояў у ёй будзе дзейнічаць?

**Ядло́вец** — хваёвы куст, радзей дрэва сямейства кіпарысавых.
**Драпе́жнік** — той, хто паядае іншых жывёл.
**Небара́ка** *(разм.)* — няшчасны, варты спагады, спачування чалавек.
**Памярко́ўны** — які лёгка прыстасоўваецца да іншых, добразычлівы.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі